Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

# ДЫЗАЙН

Вучэбная праграма
для вышэйшых вучэбных устаноў
па спецыяльнасці 1-18 01 01 народная творчасць
напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-04 (народныя рамёствы)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Зацверджана на пасядженні кафедры

Пратакол №10 ад 12.05.2012 г

Заг. кафедры Шаура Р.Ф.

Праграму распрацавала дацэнт кафедры народнага ДПМ Л.А.Малахава

Рэцэнзент: Л.Я Дзягілеў, загадчык кафедры дызайна Інстытута сучасных ведаў імя Шырокава, дацэнт

Рэкамендавана да друку на пасяджэнні Прэзідыума вучэбна-метадычнай рады Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

(м-ц) 2 г. (пратакол № )

Вучэбная праграма раскрывае мэты і задачы курса дызайну для студэнтаў і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва

*УА"Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў", 2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

ДЫЗАЙН - адна з вядучых дысцыплін у сістэме вучэбных прадметаў у падрыхтоўцы студэнтаў па спецыялізацыі «Народнае ДПМ». Педагагічная практыка існуючых школ дызайна паказвае, што ўсе яны ў сваёй дзейнасці зыходзяць з розных канцэптуальна-тэарэтычных мадэляў дызайна, таму ўсе вучэбныя праграмы і метады выкладання па іх істотна адрозніваюцца як па зместу, так і па формах метадычнай арганізацыі, і таму адыгрываюць розную ролю ў прафесійнай падрыхтоўцы і маюць рознае значэнне для развіцця мастацка-кампазіцыйнага майстэрства будучых спецыялістаў. У гэтым сэнсе праграма дысцыпліны «Дызайн» у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыялізацыі «народнае ДПМ» мае сваю спецыфіку і адыгрывае пэўную ролю ў вывучэнні і пашырэнні лепшых нацыянальных традыцый айчынных промыслаў.

Далейшае вывучэнне заканамернасцей кампазіцыі ва ўзаемасувязі з тэхналагічнымі і канструктыўнымі магчымасцямі розных матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў дэкаратыуна-прыкладных напрамках народных промыслаў, рэалізуецца ў практычных заданнях па аб'ёмна-прасторавому мадэляванню. Гэтыя заданні дазваляюць замацаваць на практыцы раней атрыманыя веды аб уласцівасцях, якасцях і сродках кампазіцыі ў яе базавых катэгорыях:

Тэктоніка (форма і канструктарская аснова) і аб'ёмна - прасторавая структура (адносіны ўзаемапранікальных кампанентаў), садзейнічаюць станаўленню праектнага мыслення і авалоданню метадалагічнымі прынцыпамі вобразнага, мастацка-кампазіцыйнага формаўтварэння. Праектаванне ў дызайне цесна звязана з аналізам складаных і рознаякасных з'яў рэчаіснасці. Таму неад'емнай складаючай праектнага мастацтва з'яўляюцца такія паняцці, як кампазіцыйна-вобразнае пачуцце гармоніі, мастацкая выразнасць, пластычнае і стылёвае адзінства. Гэта вызначае асаблівасці структурнай пабудовы сістэмы вучэбнай паслядоунасці ў пастаноўцы і выкананні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канкрэтных заданняў, а таксама сумеснай працы выкладчыка і студэнта ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

"Дызайн" дае магчымасць набыцця шэрагу спецыяльных ведаў, якія з'яўляюцца неабходнымі і аб'ядноўваюць многія мастацкія дысцыпліны (такія, як малюнак, жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, канструяванне, колеразнаўства, дызайн), а таксама дапамагаюць практычнаму авалоданню імі.

Асноўным прынцыпам тэхналогіі навучання дызайну з'яўляецца паслядоўнасць і засваенне ведаў: ад тэарэтычнага разбору і асэнсавання пастаўленай задачы – праз паслядоўнае яе вырашэнне метадам эскізных пошукаў – да лагічнага завяршэння ў выглядзе чыставой падачы графічнай і аб'емна-пластычнай частак праекта.

Асноўны ***змест*** дысцыпліны складаюць тэмы, якія паступова знаёмяць студэнтаў з метадамі стварэння розных відаў кампазіцыі: мастацкай арганізацыяй плоскасці, аб'ёма, прасторы, а таксама - з выкарыстаннем і ўзаемадзеяннем розных пластычных і колеравых сродкаў. Акрамя таго, студэнты вывучаюць асаблівасці праектавання і канструявання. Усе вучэбныя, творчыя і курсавыя праекты ў час навучання выконваюцца ў розных графічных тэхніках і з выкарыстаннем разнастайных тэхнічных сродкаў; на старэйшых курсах вялікая ўвага надаецца тэхніцы выканання праектаў, стылёваму адзінству, вобразнай і колеравай выразнасці. Стварэнне цэласнай сістэмы ансамбля прадметнага асяроддзя з'яўляецца адным з важных напрамкаў творчай дзейнасці мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асноўнай ***мэтай*** дысцыпліны "Дызайн" з'яўляецца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне эстэтычнага светапогляду сучаснага мастака на аснове асэнсавання, ужывання і трансфармавання нацыянальных традыцый у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, а таксама - фарміраванне ў будучых спецыялістаў навукова абгрунтаваных ведаў аб стварэнні франтальнай, аб'емнай і аб'емна-прасторавай кампазіцыі у ДПМ, асноў каструявання і праектавання аб'ектаў функцыянальнага асяроддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Задачамі*** курса з’яўляюцца засваенне ведаў з гісторыі, тэорыі і методыкі прадмета, прафесійнае авалоданне асноўнымі сродкамі рпаектавання і канструявання, засваенне на практыцы асноўных кампазіцыйных пабудоў, авалоданне пластыкай для ўвасаблення мастацкай ідэі, авалоданне рознымі графічнымі тэхнікамі і асэнсаванае ўжыванне тэхнічных навыкаў на практыцы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя тыпы кампазіцыі ў гістарычных стылях мастацтва Сярэднявечча, Адраджэння, Барока, Класіцызму;
- віды кампазіцыйных пабудоў ў пластычных мастацтвах;
- кампаненты кампазіцыйнай пабудовы;
- спецыфіку кампазіцыйных распрацовак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве з улікам матэрыялу і тэхнікі стварэння твора;

***умець:***

- суадносіць фармальныя элементы кампазіцыі адпаведна традыцыйным акадэмічным патрабаванням;
- ствараць арыгінальныя распрацоўкі, заснаваныя на свабодных кампазіцыйных прыёмах, у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі;
- вылучаць фармальны цэнтр і сілавыя лініі кампазіцыі;
- фарміраваць цэласнасць кампазіцыі ў творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва праз суладдзе фармальных і ідэйна-сэнсавых кампанентаў.

Асноўнымі ***метадамі*** навучання дызайну з’яўляюцца:

- эмацыянальна-рацыянальны аналіз твораў сусветнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- паэтапнасць выканання плоскасна-графічных і аб’ёмных варыянтаў вырашэння пастаўленых задач;
- выкарыстанне індывідуальных і калектыўных форм працы, абмеркаванне вынікаў аўдыторных і самастойных заданняў.
- Прадмет «Дызайн» выкладаецца у 8-ым і 9-ым семестре. Гэта выклікана неабходнасцю, з аднаго боку, замацавання ведаў па кампазіцыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльных прадметах, атрыманых на 1-3 курсах, а з другога боку, ў паглыбленні творчага майстэрства і самастойнасці ў вырашэнні задач у працэсе працы над дыпломамі на 5 курсе навучання.

- Невялікая колькасць гадзін (44 у 8-ым семестры і 46 у 9-ым) звужае магчымасці ў разнастайнасці практычных заданняў, пры гэтым мяркуецца надаць большую ўвагу асобным ключавым этапам у метадычным падыходзе на прыкладзе аднаго- двух заданняў на працягу 4-га і 5-га курса.

**Формы справаздачнасці – залікі і экзамены.**

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п\п | Раздзелы і тэмы | Лекцыі | Практ заняткі | Самаст. заняткі |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны. Тэорыя і практыка дызайна ў гістарычным аспекце і ў сучаснасці. | 6 | | |
| 2. | Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя з геаметрычных фігур | | 18 | |
| 3. | Выкарыстанне колеру як сродка пабудовы ці парушэння аб'ёмнай формы | | 20 | |
| 4. | Трансфармацыя плоскасці. Дынаміка. Рэльеф як аб'ёмна-прасторавая структура. | 6 | 10 | |
| 5. | Трансфармацыя плоскасці ў аб'ём. Стварэнне дэкаратыўнай паштоўкі. | | 10 | 10 |
| 6. | Распрацоўка мадэляў плоскаснай і аб'ёмнай формаў. | | 10 | |
| 7. | Мадэлі ўпакоўкі для розных відаў дэкаратыўна прыкладнога мастацтва | | 10 | 10 |
| | Усяго | 12 | 80 | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

**Праграма 4 курса, 8 семестр**

Лекцыя (6 гадзін)

**Тэма 1. Уводзіны.Тэорыя і практыка дызайна ў гістарычным аспекце і ў сучаснасці.**

Спецыфіка дысцыпліны “Дызайн” у сістэме вучэбных прадметаў па народных промыслах і рамёствах. Сферы ўжывання прадметаў і дызайнерскіх распрацовак. Утылітарныя рэчы і складаныя асацыятыўна-вобразныя дэкаратыўныя кампазіцыі.

Для выканання практычных заданняў па дызайну выкарыстоўваюцца алоўкі і пэндзлі шырокага дыяпазону, кардон і папера рознай якасці, белая і каляровая, акварэльныя, гуашавыя, тэмперныя і акрылавыя фарбы, нажніцы і спецыяльныя прыстасаванні для працы з паперай, дадатковыя прылады і матэрыялы.

**Практычныя заняткі.**

**Тэма 2. Аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя з геаметрычных фігур**

Заданне 1. Выкананне эскізаў кампазіцыі, распрацоўка будучай канструкцыі, вырашэнне праблем камбінаторыкі.

Заданне 2. Выкананне кампазіцыі геаметрычных фігур з паперы ці картону, рэалізацыя задачы вывучэння аб’ёмна-прасторавай структуры.

**Тэма 3. Выкарыстанне колеру як сродка пабудовы ці парушэння аб’ёмнай формы**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 1. Распрацоўка пластычнага і колеравага вобразу, выкананне графічных эскізаў.

Заданне 2. Выкананне з паперы ці кардону геаметрычных фігур (куб, конус, піраміда).

Заданне 3. Апрацоўка геаметрычных целаў графікай і колерам. Вырашэнне задачы мастацкага асэнсавання аб’ёму і формы.

**Праграма 5 курса, 9 семестр**

Лекцыя (6 гадзін)

Аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя прадметнага вобраза аб’екта як адпаведнасць з сападпарадкаванасцю і суразмернасцю сэнсавага зместу яго формаўтвараючых характарыстык і сродкаў мастацка-выразнага патэнцыялу.

**Практычныя заняткі**

**Тэма 4. Трансфармацыя плоскасці. Дынаміка. Рэльеф як аб’ёмна-прасторавая структура**

Заданне 1. Адбор літаратурнага матэрыялу і пошук мастацкага вобраза. Эскіз выконваецца спачатку пры дапамозе графічных матэрыялаў. Адпрацоўваецца тэктоніка матэрыялу: форма, канструкцыя.

Заданне 2. Выкананне пластычнага рашэння. Ажыццяўленне работы над плоскасцю агульных формаў, прапрацоўка дэталяў, вырашэнне пластычных і аб’ёмна-прасторавых характарыстык задання**.**

**Тэма 5. Трансфармацыя плоскасці ў аб’ём. Стварэнне дэкаратыўнай паштоўкі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданнне 1. Праца над эскізам і мадэллю паштоўкі. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на працу з фарматам і вобразным вырашэннем твора.

Заданне 2. Студэнты працуюць над мастацкім вобразам і графічным выкананнем задання.

Заданне 3. З' яўляецца завяршальным у выкананні графічнага задання, канчатковае рашэнне колеравага і пластычнага вобраза, выкарыстанне розных дэкаратыўных матэрыялаў.

*Самастойная творчая праца*. Стварэнне серыі аб'ёмна-графічных паштовак на тэму : "Поры года", "Каляндар" і.г.д. Кансультацыі выкладчыка.

Форма кантролю – прагляд.

**Тэма 6. Распрацоўка мадэляў плоскаснай і аб'ёмнай формы.**

Заданне 1. Графічная распрацоўка эскізаў, вырашэнне пластычна-фактурных характарыстык вучэбнага задання.

Заданне 2. Галоўная мэта – стварэнне мадэлі аб'екту распрацоўка дэталяў; адпрацоўваецца тэктоніка матэрыялу : форма, канструкцыя, колер.

**Тэма 7. Мадэлі ўпакоўкі для розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.**

Заданне 1. Распрацоўка эскізаў і мадэляў плоскаснай і аб'ёмных формаў. Асобная ўвага надаецца прасторавай і канструктыўнай выразнасці аб'ёмна-пластычнага рашэння вучэбнай працы.

Заданне 2. З'яўляецца завяршальным, калі ажыццяўляецца выраб аб'ёмна-прасторавых кампазіцый у адпаведнасці з сападпарадкаванасцю і суразмернасцю сэнсавага зместу, яго формаўтвараючых характарыстык і сродкаў мастацкай выразнасці. Ствараецца канчатковая мадэль твора, праводзіцца падрыхтоўка работ для экспанавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Самастойная творчая праца*. Выкананне аўтарскай аб'ёмна-прасторавай канструкцыі з выкарыстаннем колеравых і графічных сродкаў выразнасці. Кансультацыі выкладчыка.

Форма кантролю - прагляд.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

### Асноўная літаратура


1. Арнхейм, Р. Искусство и визуальное восприятие / Р. Арнхейм; под ред. В. Шестакова. – М.: Прогресс, 1974. – 386 с.
2. Вильямс, Р. Дизайн для НЕдизайнеров / Р. Вильямс. – Спб.: Символ плюс, 2008. – 192 с.
3. Голубева, О.Л. Основы композиции / О. Л. Голубева. – М.: Сварог и К, 2008. –144 с.
4. Глазычев, В.Л. Дизайн, как он есть / В. Л. Глазычев. – М.: Сварог и К, 2005. –140 с.
5. Григорян, Е.А. Основы композиции в прикладной графике / Е. А. Григорян. – Ереван: 1986. – 32 с.
6. Джонс, Дж. Методы проектирования / Дж. Джонс. – М.: Мир, 1986. – 326 с.
7. Иттен, Иоханес. Искусство формы / Иоханес Иттен. – М.: Издатель Д. Аронов, 2009. – 136 с.
8. Иттен, Иоханес. Искусство цвета/ Иоханес Иттен. – М.: Издатель Д. Аронов, 2010. – 96 с.
9. Нешумов, Б.В. Художественное проектирование: учебное пособие для студентов и педагогов по специальностям № 2109 "Черчение, рисование и труд" / Б. В. Нешумов [и др.]; под ред. Б. В. Нешумова, Е. Д. Щедрина – М.: Просвещение, 1979. – 175 с.
10. Розенблюм, Е. А. Художник в дизайне / Е.А. Розенблюм. – М.: Искусство, 1974. – 176 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Саттон, Г. Гармония цвета. Полное руководство по созданию цветных комбинаций / Г. Саттон; Б. Вилен; пер. с англ. В. П. Воропаева. – М.: Астрель, Аст, 2004. – 215 с.
12. Туэмлоу, Э. Графический дизайн: фирменный стиль. / Э. Туэмлоу. – М.: Астрель, 2004. – 242 с.
13. Холмянский, Л. М. Дизайн: книга для учащихся. – М.: Просвещение, 1985. – 52 с.
14. Чернышев О.В. Формальная композиция. Творческий практикум / О. В. Чернышев. – Мн.: Харвест, 1999. – 312 с.
15. Яцюк, О. Основы графического дизайна на базе компьютерных технологий / О. Яцюк. – СПб.: БХВ-Петербург, 2004. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дадатковая літаратура**

1. Буймистру, Т.А. Колористика: цвет – ключ к красоте и гармонии / Т.А. Буймистру. – М.: Ниола-Пресс, 2010. – 236 с.
2. Костогрыз, О.Д. Графика. От линии к образу / О.Д. Костогрыз. – Витебск, ВГУ им. П. М. Машерова, 2005. – 90 с.
3. Иванов, В. Как создается плакат / В. Иванов. – М.: Академия художеств, 1980. – 38 с.
4. Кудрявцев, А. Шрифт / А. Кудрявцев. – М.: Университет Натальи Нестеровой, 2003. – 248 с.
5. Лещинский, А. А. Основы графики: Учебное пособие / А.А. Лещинский. – Гродно: ГрГУ, 2003. – 194 с.
6. Миронова, Л. Цвет в изобразительном искусстве / Л. Миронова. – Мн.: Беларусь, 2005. – 151 с.
7. Раппорт, С. Х. Неизобразительные формы в декоративном искусстве / С.Х. Раппорт. – М.: Искусство, 1968. – 246 с.
8. Рябов, Д. Дизайн помещений и интерьера / Д. Рябов. – Спб.: Питер, 2007. – 267 с.

9. Семченко, П.А. Основы шрифтовой графики – Мн.: Выш. школа, 1978. – 38 с.
10. Смирнов, С. И. Шрифт и шрифтовой плакат / С. И. Смирнов. – М.: Плакат, 1977. – 144 с.
11. Ульяновский, А. Мифодизайн рекламы / А. Ульяновский. – С.-Петербург: Институт Личности, 1995. – 199 с.
12. Чихольд, Я. Облик книги. Избранные статьи о книжном оформлении / Я. Чихольд. – М.: Книга, 1980. – 242 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбнае выданне

# ДЫЗАЙН

Вучэбная праграма па спецыялізацыі «народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»

Рэдактар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк ----------------------- г. Фармат 60 х84 1\16
Папера пісчая № . Друк афсетны. Ум. Друк. арк.----------
Ул.выд.арк. 0,6 Тыраж-----экз. Заказ--------
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры
220001, Мінск, вул.Рабкораўская, 17

Надрукавана на ратапрынце Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры
220001, Мінск, вул.Рабкораўская, 17